

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;
Ты яшчэ – чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на
дружбу;
Ты толькі – паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на
любоў, -
І толькі тады становішся
чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

*М. Танк*

**Рэдкалегія кабінета беларускай мовы і літаратуры**

**ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Сянно імя З.І.Азгура”**



# “І жыве твой радок, і жыве тваё слова”



Дом, у якім жылі бацькі паэта



Бацькі Максіма Танка






За восемдзесят два гады, што пражыў Максім Танк, паэт пакінуў нам вялікі скарб літаратурных шэдэўраў, прыклад цвёрдай грамадзянскай пазіцыі, памяць пра шчодрасць і адкрытасць беларускай душы. Сёння застаўся толькі светлы сум, што гэтага чалавека больш няма. Засталіся кнігі паэзіі і прозы, якія ўвабралі ў сябе фарбы і колеры роднай зямлі і мовы, раскрылі іх адметнасць і прыгажосць. Творчасць аўтара выйшла за гарызонты свайго часу, на абсягі новай эпохі, XXI стагоддзя.

Максім Танк пакінуў не толькі вялікую літаратурную спадчыну, але і свае жыццёвыя ўрокі. Урокі мудрасці і дабрыні, прастаты і сціпласці. Урокі вернасці Беларусі, якую бязмежна-горача любіў, вернасці і ўдзячнасці сваім бацькам і дзядам.

Сапраўды, напісана пра Танка шмат. Але яго паэзія невычэрпная, і час, няспынна ідучы наперад, дыктуе неабходнасць новых, больш паглыбленых падыходаў да асэнсавання яго спадчыны, новых паваротаў у раскрыцці гэтай неардынарнай духоўнай з'явы, якая спадарожнічае нам у жыцці.

## Фотавыстава




З сябрамі - пісьменнікамі



З жонкай Любоўю Андрэеўнай, 1968



З маці





На магілках паэта і яго жонкі